С37

МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УО "БАРАНОВИЧСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ"

2016

# СОДРУЖЕСТВО НАУК. БАРАНОВИЧИ-2005

## МАТЕРИАЛЫ
## МЕЖДУНАРОДНОЙ НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКОЙ КОНФЕРЕНЦИИ МОЛОДЫХ ИССЛЕДОВАТЕЛЕЙ

**22 февраля 2005 г.**
**г. Барановичи, Беларусь**

**В 2 частях**
**Часть 2**

Библиотека БарГУ
0010 8849

**Барановичи 2005**

31122

Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования
«Барановичский государственный университет»
БИБЛИОТЕКА

УДК 082(043.2)
ББК 94
С 57

*Печатается по решению совета Учреждения образования "Барановичский государственный университет", протокол № 5 от 28.01.2005 г.*

Рецензенты: доктор педагогических наук, профессор УО "Белорусский государственный университет имени Максима Танка" Л.Д. Глазырина; кандидат юридических наук, доцент Киевского национального экономического университета Е.В. Перепадя (Украина); доктор педагогических наук, профессор, Резекненская Высшая школа Велта Любкина (Латвия); доктор технических наук, профессор УО "Брестский государственный технический университет" Ю.Н. Павлючук; кандидат технических наук УО "Брестский государственный технический университет" А.В. Драган

Редакционная коллегия: В.И. Кочурко (главный редактор), П.П. Шоцкий, В.Н. Зуев, Е.И. Пономарева, К.С. Тристень, В.В. Хитрюк, С.К. Рындевич, Н.М. Сотник, Е.И. Белая, Е.Г. Карапетова, Э.И. Дмитриченко, М. Ассад, В.В. Таруц, Т.Н. Рыбина, Г.Я. Житкевич, В.Л. Гурский, Е.Л. Малиновский, А.В. Трофимчик, И.Д. Высотенко, А.А. Ковалевская, Л.И. Кочкар

С57 **Содружество наук. Барановичи-2005:** Материалы междунар. науч.-практ. конф. молодых исследователей, Барановичи, 22 февраля 2005 г.: В 2 ч. Ч. 2 / Редкол.: В.И. Кочурко (гл. ред.) и др.– Барановичи: УО "БарГУ", 2005.– 438 с.

ISBN 985-498-001-4
ISBN 985-498-003-0 (Часть 2)

В сборнике представлены статьи участников международной научно-практической конференции молодых исследователей "Содружество наук. Барановичи-2005", посвященные актуальным проблемам педагогики, психологии, методикам преподавания технических, экономических, юридических, гуманитарных наук.

Адресован студентам, аспирантам, учителям школ и преподавателям вузов, специалистам предприятий, организаций, учреждений соответствующего профиля.

ЧИТАЛЬНЫЙ ЗАЛ

**УДК 082(043.2)**
**ББК 94**

**ISBN 985-498-001-4**
**ISBN 985-498-003-0 (Часть 2)**

© УО "БарГУ", 2005

ПЕДАГОГИЧЕСКИЙ ФАКУЛЬТЕТ

# ВЫВУЧЭННЕ ТВОРАЎ АБ ВАЙНЕ Ў КАНТЭКСЦЕ ВЫХАВАННЯ ПАТРЫЯТЫЗМУ І ГРАМАДЗЯНСКАСЦІ

**Г.М. Рымша**

Навуковы кіраўнік – А.І. Белая, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

УА "Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт", г. Баранавічы, Беларусь

Гісторыя – гэта тое, што пра яе напісана. Ужо адзін гэты афарызм не дае ўсумніцца ў значэнні літаратуры для пазнання мінулага свайго народа і чалавецтва. Літаратура

не толькі раскрывае індывідуальны, непаўторны свет асобы, але і адлюстроўвае заканамернасці развіцця грамадства, рух чалавечай гісторыі.

На ўроках літаратуры ў вучняў фарміруецца ўяўленне аб сувязі пакаленняў, аб гістарычным працэсе, што аказвае вялікі ўплыў на фарміраванне светапоглядных арыентацый школьнікаў.

Пазнаючы гістарычную рэальнасць, вучні павінны навучыцца правільна ацэньваць уклад, які ўнеслі ў гуманістычны прагрэс мінулыя пакаленні, вызначаць іх месца і ролю ў барацьбе супраць грамадскага зла. Асэнсоўваючы дзейнасць папярэднікаў, вучні глыбей спасцігаюць гістарычную місію свайго пакалення, перажываюць пачуццё далучанасці да вялікай гістарычнай творчасці. Аднак гэта магчыма пры адпаведнай арганізацыі вывучэння твораў аб Вялікай Айчыннай вайне, здольнай забяспечыць адэкватны эмацыянальны водгук навучэнцаў, мэтазгодную інтэлектуальную дзейнасць і вартасныя эстэтычныя адносіны да праблемы "сацыяльнай бессмяротнасці чалавека".

Вынікі анкетавання школьнікаў (выбарка – 86 чалавек) пераконваюць у тым, што Вялікая Айчынная вайна "самая жывая старонка нашай гісторыі" (галоўным дзяржаўным святам 32,5% рэспандэнтаў лічаць Дзень незалежнасці, 22,1% – Дзень Перамогі, а самай значнай падзеяй беларускай гісторыі названа Вялікая Айчынная вайна). Вартыя ўвагі і высновы сённяшніх студэнтаў – заўтрашніх настаўнікаў беларускіх школ – па тэме "Вайна вачыма майго пакалення".

"...Што ж такое вайна для майго пакалення? Для адных яна асацыіруецца з гераізмам салдат, для другіх вайна – гэта смерць і разруха, а для іншых – гэта проста слова. І менавіта за гэтых "іншых" вельмі сорамна. Мне здаецца, што вайна для іх – гэта яшчэ адзін непасільны параграф з гісторыі Беларусі".

"...Тэма вайны – гэта жыццёва значная тэма, таму абыходзіць яе мы не павінны. Мы павінны ведаць, што прыносіць і што забірае яна, умець разважаць і аналізаваць усе з'явы хоць бы дзеля таго, каб навучыцца аддзяляць дабро, набываць вопыт і выносіць урокі нават з яўна негатыўнага".

На нашай зямлі шмат помнікаў героям і ахвярам. Творы беларускіх пісьменнікаў – таксама ўражлівыя помнікі загінуўшым у гады вайны. Літаратура можа і павінна быць сродкам дасягнення высакароднай мэты – выхавання добрага і мужнага сэрца.

Вывучэнне твораў ваеннай тэматыкі мае на ўвазе, безумоўна, пашырэнне і паглыбленне ведаў пра гэты значны і трагічны этап нацыянальнай і сусветнай гісторыі. Творы В. Быкава, А. Адамовіча, І. Навуменкі, І. Чыгрынава, І. Шамякіна, Я. Брыля гавораць пра тое, якой цаной заплочана за права жыць і радавацца ў роднай краіне.

Глыбіннае засваенне твораў ваеннай тэматыкі залежыць у многім ад папярэдняй псіхалагічнай падрыхтоўкі вучняў, іх гатоўнасці да ўспрымання гераічнага ў непарыўнай сувязі з трагічным. На саміх уроках ад настаўніка патрабуецца асаблівая чуйнасць у адносінах як да мастацкага твора, так і да вучняў. Неапраўданае нагрувашчванне "прыёмаў", ілюстрацый, нагляднасці ў час работы з творам можа адцягнуць увагу вучняў ад галоўнага, выбіць іх са стану глыбокай унутранай засяроджанасці, без чаго не можа быць паспяховага засваення зместу твораў.

Выхаванне патрыятычных і гуманістычных пачуццяў, фарміраванне адэкватнага погляду на трагічнае і гераічнае, асэнсаванне подзвігу змагароў, якія выратавалі чалавецтва ад фашысцкай няволі, – вось асноўныя напрамкі ў рабоце над творамі ваеннай тэматыкі. У працэсе іх вывучэння настаўнік літаратуры ў першую чаргу павінен актыўна выкарыстоўваць агульнапедагагічныя метады фарміравання свядомасці: гутарку, перакананне, метад станоўчага прыкладу, дыспут. Асабліва важнае значэнне набывае даследаванне як адзін з метадаў пазнання і навучання. Метад праблемных сітуацый – вядучы метад фарміравання свядомасці і ў той жа час – аснова рэалізацыі прынцыпу творчага навучання, па-за якім немагчыма ўявіць працэс літаратурнай адукацыі ўвогуле. Да таго ж, "мова ўрока, які кліча ў кнігу, напрамую звязана з майстэрствам настаўніцкага

маналога" (Я.М. Ільін). Менавіта якасць слова настаўніка абумоўлівае першапачатковае "эмацыянальнае заражэнне", а на яго аснове ўзнікаюць эмпатыя і рэфлексія, у т.л. эстэтычнае асэнсаванне з'яў, без чаго ўвогуле немагчыма выхаванне.

Д. Карнегі сцвярджае: "Кожная нацыя лічыць сябе вышэй за другія нацыі. Гэта параджае патрыятызм... і войны". Беларусь ні разу не фігуравала на сусветнай арэне як агрэсар. Звышкаштоўнасцю для беларусаў з'яўляецца талерантнасць. Але час ад часу ўзнікаюць такія сітуацыі, калі немагчыма абысціся без кіруемай агрэсіўнасці высокага ўзроўню, напрыклад, калі неабходна са зброяй у руках стаць на абарону Радзімы.

Творы аб вайне разбураюць ходкае меркаванне пра беларуса як пра носьбіта спрадвечнай пакорлівасці, забітасці, не адмаўляюць яму ў праве звацца чалавекам, паказваюць, як вырываюцца на волю тыя высокамаральныя якасці, што доўгі час былі прыдушаны страхам перад мацнейшым. Кожны з герояў робіць свой выбар ці здзяйсняе свой подзвіг.

У творах ваеннай тэматыкі Быкава, Брыля, Адамовіча, Шамякіна, якія ў працэсе літаратурнай адукацыі выступаюць як крыніца патрыятычных і грамадзянскіх пачуццяў, актуальная праблема "сваіх" і "чужых". У працэсе фарміравання грамадзянскасці, акрамя агульнапедагагічных метадаў, шырокае прымяненне знаходзяць і спецыфічныя. Так, выкарыстоўваючы прынцып інтэрактыўнай гульні [4], можна правесці работу над творам В. Быкава "Сваякі" наступным чынам.

Кожны вучань атрымлівае картку з роляй, якая не называецца астатнім удзельнікам гульні. Прычым, неабходна максімальна пераўвасобіцца ў сваю ролю. Удзельнікам прапануецца канкрэтная сітуацыя: маці просіць сваяка – паліцая Дразда – дапамагчы ёй: папалохаць яе "амаль дарослых" дзяцей, якія не слухаюцца. Кожны вучань разглядае сітуацыю з пункту погляду сваёй ролі (на гэта яму даецца не больш за 10 хвілін), а потым дзеліцца сваімі думкамі з астатнімі. Выкананне такіх творчых заданняў спрыяе абвастрэнню чытацкай увагі да твораў аб вайне, фарміраванню дывергентнага, праніклівага погляду на іх, крытычнага мыслення, узмацняе асобаснае ўздзеянне герояў і падзей на свядомасць чытачоў-школьнікаў.

Актыўныя і інтэрактыўныя формы навучання, дыскусійнасць, імітацыя вучнямі разнастайных сацыяльных роляў у ходзе дзелавых гульняў на ўроках літаратуры ўзмацняюць ролю гэтага мастацтва ў працэсе грамадзянскай адукацыі, набыцці грамадзянскіх кампетэнцый, што надзвычай актуальна на сучасным этапе.

Аднак аснова грамадзянскіх вартасцей чалавека – гуманнасць (М.І. Пірагоў). Гуманныя адносіны да людзей заснаваны на суперажыванні. Шляхі яго развіцця: навучанне дзяцей мастацтву разумець іншага і фарміравання "самага істотнага атрыбута духоўнай натуры чалавека – паняцця пра сэнс жыцця, ад якога неад'емна паняцце "абавязак".

Навучыць і выхаваць чалавека гуманнага няпроста. Трэба дабіцца таго, каб ён самастойна думаў, не прымаў усё на веру, а сумняваўся, сам праз нястомную працу розуму і сэрца даходзіў да сутнасці жыццёвых з'яў, падзей і на аснове гэтага вызначаў сваё месца ў грамадстве. А гэту праўду жыцця, гісторыю нашай Радзімы з усімі яе супярэчнасцямі, гэты свой маральны вопыт павінен данесці да вучняў настаўнік.

**Літаратура**

1. Инновационные методы обучения в гражданском образовании / В.В. Величко, Д.В. Карпиевич, Е.Ф. Карпиевич, Л.Г. Кирилюк. – 2-е изд. доп. – Мн.: Медисонт, 2001. – 168 с.

2. Сухарев В.А., Сухарев М.В. Европейцы и американцы глазами психолога. – Мн.: Беларусь, 2000. – 366 с.

3. Гражданское образование: зарубежный опыт, проблемы развития / Отв. ред. А.А. Михайлов, В.А. Дунаев. – Мн., 1999. – 94 с.